***Ад тэорыі да практыкі.*** Падрыхтуйце паведамленне «Як змяніліся гандаль, фінансавая дзейнасць і страхаванне пры актыўным развіцці інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій».

## § 41. Геаграфія навукова-адукацыйных і сацыяльных паслуг

***Успомніце.*** *Якія ступені адукацыі вы ўжо прайшлі і якія плануеце пераадолець? Якія ўстановы культуры вы наведвалі?*

**1. Адукацыя і навуковая дзейнасць.** Беларусь мае развітую сістэму адукацыі. Установы адукацыі размешчаны раўнамерна па ўсёй краіне. Сістэма адукацыі ўключае ўстановы, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы рознага ўзроўню (мал. 137).

Узровень пісьменнасці дарослага насельніцтва, паводле перапісу насельніцтва 2019 г., складае 99,9 %, ахоп адукацыяй занятага насельніцтва — 97,8 %. Па паказчыку «Доступ да базавых ведаў» у Індэксе сацыяльнага прагрэсу Беларусь на 2025 г. займае 22-е месца сярод 170 краін свету.

У Беларусі добра развітая сістэма дашкольнай адукацыі. Да ўстаноў дашкольнай адукацыі адносяцца дзіцячыя сады, санаторныя дзіцячыя сады, дашкольныя цэнтры развіцця дзіцяці. Іх наведваюць больш за 89 % дзяцей дашкольнага ўзросту. У Беларусі каля 3700 устаноў дашкольнай адукацыі, якія наведваюць больш за 355 тыс. чалавек. Найбольшы ахоп дзяцей такімі ўстановамі ў Мінску.

Лідзіруюць па колькасці навучэнцаў установы агульнай сярэдняй адукацыі. Да іх адносяцца пачатковыя, базавыя, сярэднія школы, гімназіі, ліцэі, гімназіі — каледжы мастацтваў, суворaўскае і кадэцкае вучылішчы, санаторныя школы-інтэрнаты, школы-інтэрнаты для дзяцей-сірот, вучылішчы алімпійскага рэзерву. Іх агульная колькасць больш за 2800. Гімназій і ліцэяў налічваецца каля 230. Агульная колькасць навучэнцаў у краіне за апошнія гады ўзрасла амаль да 1090 тыс. чалавек.

**Установы адукацыі** →

- Дашкольнай адукацыі
- Агульнай сярэдняй адукацыі
- Прафесійна-тэхнічнай адукацыі
- Сярэдняй спецыяльнай адукацыі
- Вышэйшай адукацыі

Мал. 137. Асноўныя тыпы ўстаноў адукацыі ў Беларусі

Сярод апошніх тэндэнцый сістэмы агульнай сярэдняй адукацыі — функцыянаванне класаў прафесійнай накіраванасці: ваенна-патрыятычных, педагагічных, спартыўна-педагагічных, інжынерных, аграрных і інш. Ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі створаны інжынерна-тэхнічныя цэнтры.

По карце атласа (с. 64) вызначце, якія тыпы ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі пераважаюць у Беларусі. У якіх рэгіёнах найбольшая колькасць устаноў і вучняў?

Да ўстаноў прафесійна-тэхнічнай адукацыі адносяцца каледж і ўстановы адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы прафесійна-тэхнічнай адукацыі. Яны забяспечваюць падрыхтоўку кадраў па розных спецыяльнасцях. Размешчаны ўстановы раўнамерна па тэрыторыі Беларусі. У краіне каля 170 устаноў, у якіх навучаецца каля 65 тыс. чалавек.

Прааналізуйце карту атласа (с. 64) і вызначце віды, асноўныя профілі ўстаноў прафесійна-тэхнічнай адукацыі. Якія з іх працуюць у вашым рэгіёне?

Спецыялістаў больш высокай кваліфікацыі рыхтуюць установы сярэдняй спецыяльнай адукацыі. Яны прадстаўлены 224 разнапрофільнымі каледжамі. Больш за ўсё сярэдніх спецыяльных каледжаў у Мінску, дзе прадстаўлены амаль усе профілі. Шмат каледжаў у Гомелі, Гродне, Віцебску, Бабруйску і Магілёве. Кожны трэці навучэнец асвойвае спецыяльнасць тэхнічнага профілю, кожны шосты — эканамічнага і юрыдычнага профілю. Спецыяльнасці, звязаныя з сельскай гаспадаркай, атрымліваюць 11,3 % навучэнцаў.



Мал. 138. Будынак навучальнага корпуса факультэта геаграфіі і геаінфарматыкі БДУ, г. Мінск

Падрыхтоўку высокакваліфікаваных спецыялістаў у Беларусі ажыццяўляюць установы вышэйшай адукацыі (УВА). Да іх адносяцца ўніверсітэт, акадэмія (кансерваторыя), інстытут. У Беларусі 49 устаноў вышэйшай адукацыі, якія размешчаны ў 11 гарадах. Яшчэ ў пяці гарадах падрыхтоўку спецыялістаў ажыццяўляюць філіялы УВА.

Пераважная большасць устаноў адносіцца да класічных (БДУ (мал. 138), універсітэты ў Гомелі, Гродне, Брэсце, Магілёве, Віцебску, Наваполацку,

Баранавічах) і профільных (БНТУ, БАТУ, БДПУ імя Максіма Танка і інш.) універсітэтаў. Больш за палову УВА краіны знаходзіцца ў Мінску.

Колькасць студэнтаў ва ўстановах вышэйшай адукацыі — каля 225 тыс. Ва УВА краіны штогод навучаецца каля 15 тыс. замежных студэнтаў, што сведчыць аб высокім узроўні адукацыі ў Беларусі.

З адукацыяй цесна звязана навуковая дзейнасць. У цяперашні час навуковымі даследаваннямі займаюцца больш за 25 тыс. чалавек у 440 арганізацыях. Пераважная большасць навуковых арганізацый знаходзіцца ў Мінску. Найбуйнейшы цэнтр навуковых даследаванняў у краіне — Нацыянальная акадэмія навук Беларусі.

З мэтай развіцця цікавасці ў адораных вучняў да навукова-тэхнічнай і інавацыйнай дзейнасці ў Мінску ў 2021 г. быў адкрыты Нацыянальны дзіцячы тэхнапарк. Штогод у ім праходзяць навучанне больш за 1500 вучняў па 15 сучасных кірунках (авіякасмічныя тэхналогіі, «зялёная» хімія, інжынерная экалогія, нанаіндустрыя і нанатэхналогіі, віртуальная і дапоўненая рэальнасць, інфармацыйная бяспека, лазерныя тэхналогіі, робататэхніка, энергетыка будучыні і інш.).

Навуковая праца таксама праводзіцца ўстановамі вышэйшай адукацыі, шэрагам профільных навукова-даследчых інстытутаў. Доля навукаёмістых галін эканомікі ў ВУП у апошнія гады павышаецца і складае 36 %.

Актываваць дзейнасць маладых навукоўцаў і вынаходнікаў у галіне інавацыйнай дзейнасці дазваляе маладзёжны праект «100 ідэй для Беларусі». Праходзіць рэспубліканскі конкурс прафесійнага майстэрства ProfSkills Belarus па 30 кірунках (будаўнічыя, інфармацыйныя і камунікацыйныя тэхналогіі, творчыя прафесіі і мода, вытворчасць і інжынерныя тэхналогіі, транспарт і лагістыка, сацыяльныя і персанальныя паслугі). Якія яшчэ вы ведаеце праекты, конкурсы, якія дазваляюць выявіць таленавітых маладых людзей, якія праяўляюць цікавасць да навуковай дзейнасці?

**2. Ахова здароўя.** Важным відам эканамічнай дзейнасці сферы паслуг з'яўляецца ахова здароўя. Галоўная мэта сістэмы аховы здароўя Рэспублікі Беларусь — фарміраванне здаровай нацыі і захаванне здароўя насельніцтва. Удзельная вага аховы здароўя і сацыяльных паслуг складае 4,3 % ВУП.

На здароўе чалавека ўплывае шмат фактараў, у тым ліку і сам чалавек. Здароўе чалавека значна больш залежыць ад яго звычак і харчавання, чым ад намаганняў дактароў. Растлумачце, чаму для чалавека важныя адмова ад шкодных звычак і правільнае харчаванне.

Медыцынская дапамога аказваецца ўстановамі аховы здароўя, якія можна падзяліць на групы. У першую групу ўваходзяць установы рэспубліканскага ўзроўню: рэспубліканскія навукова-практычныя цэнтры (РНПЦ), спецыялізаваныя клінікі, медыцынскія цэнтры, цэнтры рэпрадуктыўнага здароўя, якія аказваюць высокатэхналагічныя віды медыцынскіх паслуг. Размяшчаюцца яны ў асноўным у Мінску і вакол яго, а таксама ў абласных цэнтрах. Другую групу складаюць спецыялізаваныя дыспансеры, бальніцы, дыягнастычныя цэнтры, якія знаходзяцца ў буйных гарадах. У трэцюю групу ўвайшлі паліклінікі, бальніцы, дыспансеры, радзільныя дамы, амбулаторыі, станцыі хуткай дапамогі, фельчарска-акушэрскія пункты і г. д. Яны знаходзяцца ў гарадах і сельскай мясцовасці. Асобную групу ўтвараюць санаторна-курортныя ўстановы, якія аказваюць медыцынскія паслугі аздараўленчага і прафілактычнага кірунку.

Дзякуючы клопату дзяржавы ўстановы аховы здароўя аснашчаны сучасным абсталяваннем. У медыцынскую практыку ўкараняюцца новыя ўнікальныя тэхналогіі. У Беларусі паспяхова функцыянуюць РНПЦ, якія шырока вядомыя ва ўсім свеце («Маці і дзіця», «Кардыялогія», неўралогіі і нейрахірургіі, траўматалогіі і артапедыі і інш.). Цэнтры аказваюць медыцынскія паслугі грамадзянам як Беларусі, так і замежных краін, што пацвярджае высокі ўзровень медыцыны ў краіне.



Мал. 139. 2-я гарадская клінічная бальніца, г. Мінск

Забяспечанасць насельніцтва паслугамі аховы здароўя ў Беларусі вышэйшая, чым у многіх краінах. Функцыянуе больш за 580 бальнічных арганізацый (мал. 139), больш за 2600 амбулаторый і паліклінік, каля 120 станцый медыцынскай хуткай дапамогі.

У Беларусі на 10 000 чалавек прыпадае 52 практыкуючыя ўрачы. У нашай краіне гэты паказчык вышэйшы, чым у многіх краінах Еўропы.

**4. Турызм.** Вялікае значэнне ў сферы паслуг мае турызм і адпачынак. Гэта адзін з перспектыўных відаў эканамічнай дзейнасці, які цесна ўзаемадзейнічае з аховай здароўя, фізкультурай і спортам, установамі культуры і іншымі відамі эканамічнай дзейнасці сферы паслуг. У Беларусі функцыянуе каля 1200 арганізацый, якія займаюцца турысцкай дзейнасцю. Больш за палову іх размешчаны ў Мінску, астатнія даволі раўнамерна прадстаўлены па краіне.

Турызм падзяляецца на ўязны і выязны. Штогод наведвае Рэспубліку Беларусь каля 145 тыс. замежных турыстаў, у тым ліку і дзякуючы ўвядзенню бязвізавага ўезду ў нашу краіну. У апошнія гады ўзрасла роля ўнутранага турызму (больш за 1530 тыс. чал.). Сёння турыстычная інфраструктура Беларусі дазваляе бяспечна і хутка дабрацца ў любы куток краіны, з камфортам размясціцца, пакаштаваць нацыянальныя стравы. Працуюць больш за 370 атэляў, гасцінічных і турысцка-гасцінічных комплексаў, больш за 470 санаторна-курортных і аздараўленчых арганізацый. Паспяхова развіваецца аграэкатурызм, гісторыка-культурны, медыцынскі, лячэбна-аздараўленчы, паляўнічы, прамысловы, гастранамічны турызм.

Прааналізуйце карты атласа (с. 26, 69–71) і вызначце, як развіта турыстычная інфраструктура вашага рэгіёна, якія віды турызму атрымалі развіццё.

У краіне надаецца вялікая ўвага развіццю фізічнай культуры і спорту. Гэты від паслуг неабходны для падтрымання здаровага ладу жыцця. Функцыянуе больш за 23 тыс. спартыўных аб’ектаў і збудаванняў. Сярод іх спартыўныя залы, плавальныя басейны, вяслярныя каналы, велатрэкі, стадыёны, манежы і іншыя аб’екты. Такія спартыўныя збудаванні, як «Мінск-арэна», «Чыжоўка-Арэна», гарналыжныя комплексы «Сілічы» і «Лагойск», рэспубліканскія цэнтры алімпійскай падрыхтоўкі «Раўбічы», «Стайкі», «Ратамка», фізкультурна-спартыўнае збудаванне «Палац мастацкай гімнастыкі», Нацыянальны алімпійскі стадыён «Дынама» і інш., пастаянна прымаюць буйныя спартыўныя спаборніцтвы і вядомыя далёка за межамі краіны.

Штогод у краіне праводзяцца каля 22 тыс. спартыўна-масавых мерапрыемстваў. Традыцыйнымі сталі спаборніцтвы «Беларуская лыжня» і Мінскі паўмарафон. Праводзяцца спаборніцтвы сярод дзяцей і падлеткаў па біятлоне «Снежны снайпер», па футболе — «Скураны мяч», рэспубліканскі хакейны турнір «Залатая шайба» на прызы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і інш. На самым высокім узроўні ў Беларусі праводзяцца міжнародныя спаборніцтвы, сярод якіх былі II Еўрапейскія гульні, II Гульні краін СНД.

Вялікае значэнне ў сферы сацыяльных паслуг маюць культура і мастацтва.

Прааналізуйце карту атласа (с. 68) і вызначце размяшчэнне тэатраў, музеяў і іншых установ культуры па тэрыторыі Беларусі.

**Падвядзём вынікі.** Адукацыя і ахова здароўя з'яўляюцца вядучымі відамі навукова-адукацыйных і сацыяльных паслуг і маюць сетку ўстаноў, распаўсюджаных па ўсёй краіне. Большасць устаноў навукі і культуры размешчаны ў буйных гарадах краіны. У Беларусі развітыя турыстычная інфраструктура, фізічная культура і спорт.

***Праверце сябе.*** 1. На якія групы падзяляюцца ўстановы адукацыі? Назавіце ўстановы, якія адносяцца да кожнай групы. 2. На якія групы падзяляюцца ўстановы аховы здароўя? 3. Якія віды турызму атрымалі развіццё ў Беларусі?

***Праблемныя пытанні.*** 1. Чаму ў Беларусі вялікая ўвага надаецца развіццю цікавасці да навуковай дзейнасці вучняў і студэнтаў? 2. Чаму ў Беларусі вялікая ўвага надаецца развіццю аховы здароўя? Якія дасягненні ў галіне медыцыны вам вядомыя?

***Ад тэорыі да практыкі.*** Распрацуйце інфармацыйныя буклеты пра свой рэгіён, на якіх адлюструеце інфармацыю: а) пра ўстановы адукацыі, б) установы аховы здароўя, в) турыстычныя аб'екты і ўстановы культуры.

## § 42. Геаграфія транспарту

***Успомніце.*** *Для чаго выкарыстоўваецца транспарт? Якія віды транспарту вы ведаеце?*

**1. Фарміраванне і развіццё транспартнай сеткі.** У кожнай краіне развіваецца транспарт як адзін з вядучых відаў эканамічнай дзейнасці сферы паслуг. Транспарт забяспечвае перавозку пасажыраў і грузаў з аднаго рэгіёна ў другі, тым самым падтрымлівае вытворчыя сувязі і спрыяе эканамічнаму развіццю. Падзяляецца транспарт на пасажырскі і грузавы. Транспартныя паслугі фарміруюць больш за 40 % агульнага аб'ёму экспарту паслуг краіны. У структуры ВУП Беларусі доля транспарту складае каля 5 %.

Цяпер у краіне развіваюцца ўсе віды транспарту. Нават марскі транспарт прадстаўлены транспартнай кампаніяй «Беларускае марское параходства», якая працуе ў галіне марскіх перавозак.

Геаграфічнае становішча Беларусі ў цэнтры Еўропы абумовіла фарміраванне густой транспартнай сеткі (сеткі шляхоў зносін).